ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
______ І.Г.Лашкевіч
«20» сакавіка 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Дата правядзення: 29 сакавіка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

## VII клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Запішыце лічэбнік словам у адпаведнай форме: *Паміж 2 маладымі бярозкамі.* ____________________.
2. Як называецца самы напружаны момант у празаічным творы?____________________.
3. ______________ – беларускі народны тэатр лялек на рэлігійную і бытавую тэматыку.
4. Традыцыі беларусаў. Пры засяленні на новую сядзібу народная традыцыя раіць на падворак першым запусціць пеўня. А вось непасрэдна ў хату (або ў новую кватэру) першай павінна была зайсці … ____________________.
5. У форме якога ладу ўжыты дзеясловы ў наступным тэксце?

*Тое, што Беларусь з'яўляецца шахцёрскай краінай, ведаюць нават далёка за яе межамі. Звязана гэта найперш з залежамі калійнай солі ў Салігорску. Па яе здабычы Беларусь займае трэцяе месца ў Еўропе. АДКАЗ:*____________________

**Заданне 2. Паглядзіце ўважліва на пары слоў. Якімі гукамі адрозніваюцца словы? У таблічцы пастаўце адпаведную лічбу: глухімі гукамі – 1; звонкімі – 2; калі гукі ў словах аднолькавыя – 3; галоснымі – 4. Побач з лічбай запішыце гукі, якімі адрозніваюцца словы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за правіліна вызначаную характарыстыку гука, 0,5 бала – за правільна запісаную пару гукаў).*

| | |
|---|---|
| Узор: чыста – часта | 4 [ы]-[а] |
| гуж – гуз | |
| задатак – дадатак | |
| дзядзя – дзяжа | |
| грыб – грып | |
| лес-лёс | |

**Заданне 3. Прачытайце тэкст, які насычаны фразеалагізмамі. Знайдзіце іх у тэксце і замяніце адным словам ці выразам.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільна знойдзены фразеалагізм; 0,5 бала – за правільную замену).*

Добрыя ўчынкі

Андрэй і Пеця – родныя браты. Андрэй быў старэйшы і часта задзіраў нос. Калі Пеця рыхтаваў урокі, то Андрэй звычайна гультаяваў. У вольны час любіў хадзіць на галаве. Калі малодшы брат не рабіў так, як ён, то быў вострым на язык.

Вечарам бацька прапанаваў дзецям палічыць свае добрыя справы за дзень і даў кожнаму маленькую скрыначку. А на стол палажыў жалуды. Па чарзе гаварылі хлопчыкі і за кожны добры ўчынак клалі ў скрыначку жолуд. Скрыначка Пеці была амаль поўная, а ў Андрэя жалудоў было як кот наплакаў. Андрэй адразу прыкусіў язык, з павагай глянуў на брата і задумаўся…

1. ______________________________
2. ______________________________
3. ______________________________
4. ______________________________
5. ______________________________

**Заданне 4. Запішыце часціны мовы ў адпаведнай граматычнай форме.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожную правільна запісаную форму).*

| | | |
|---|---|---|
| птушаня | М.скл.адз.л | |
| сорам | Р.скл., адз.л | |
| шчаслівая | кароткая форма, ж.р., адз.л. | |
| вясёлы | складаная форма найвышэйшай ступені | |
| кнігарня | Р.скл., мн.л. | |
| пяцьсот сем | Т.скл. | |
| папрасіць | форма ўмоўнага ладу, ж.р. | |
| сёстры | Р.скл., мн.л. | |
| жыць | мн.л., 2-я асоба | |
| паснедаць | форма будучага часу 3-й асобы адз.л. | |

**Заданне 5. Папрацуйце перакладчыкамі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| два года | |
| благодарить учителя | |
| выбраться за грибами (в лес) | |
| издеваться над слабым | |
| они умнее своих одногодков | |

**Заданне 6. Прачытайце тэкст і запоўніце прапанаваную табліцу, вызначыўшы адпаведныя характарыстыкі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

*(1 бал – за кожную правільна запоўненую клетку).*

З даўніх часоў яна была за вёскай. І ў зімовую сцюжу, і ў летнюю спёку заўсёды бруілася там вада. А калі побач праклалі дарогу – крынічкі не стала. Віднелася толькі пляма, з якой ледзь сачылася вада. Усе бачылі, што крынічка памірае, але толькі адзін чалавек, Сямён, узяўся выратаваць яе. Ён змайстраваў маленькі зруб, апусціў у зямлю, і крынічка ажыла. Захадзілі на дне пясчынкі. У крыштальнай вадзе пачало паблісkваць сонца. І зноў прахожы мог прагнаць смагу.

Сямёна даўно няма. А крынічка жыве і зараз. І называюць яе Сямёнавай.

| | |
|---|---|
| тып тэксту | |
| тэма тэксту | |
| сувязь слоў у тэксце | |
| асноўная думка тэксту выражана…<br>(запішыце словамі з тэксту) | |
| сродкам сувязі сказаў у тэксце з’яўляецца | |

**Заданне 7. Разгледзьце ўважліва малюнак. Якому ўстойліваму выразу ён адпавядае? Складзіце невялікі тэкст, у якасці назвы запішыце ўзгаданы фразеалагізм.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

**Заданне 8. Размяркуйце пісьменнікаў (паэтаў) у залежнасці ад месца іх нараджэння: Уладзімір Караткевіч, Алесь Казека, Пятрусь Броўка, Алесь Пісьмянкоў, Рыгор Барадулін.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Магілёўская вобласць | Віцебская вобласць |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

**Заданне 9. Узгадайце творы, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках беларускай літаратуры. Вызначце трэцяе лішняе ў залежнасці ад тэмы, узнятай у творы.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № п/п | Творы | Трэцяе лішняе |
|---|---|---|
| 1. | Іван Мележ “ Першы іней”, Янка Брыль “Над зямлёй – красавіцкае неба”, Уладзімір Караткевіч “Лебядзіны скіт” | |
| 2. | Вячаслаў Адамчык “Салодкія яблыкі”, Хрысціна Лялько “Касцы”, Міхась Лынькоў “Васількі” | |
| 3. | Якуб Колас “Ручэй”, Максім Багдановіч “Музыка”, Тарас Хадкевіч “Крынічка” | |
| 4. | Народная легенда “Нарач”, народная легенда “Пестунь”, Максім Танк “Ля вогнішч начлежных” | |
| 5. | Якуб Колас “Дарэктар” (урывак з паэмы “Новая зямля”, Алесь Гарун “Датрымаў характар”, Якуб Колас “У старых дубах” | |

**Заданне 10. Каму з пералічаных герояў аповесці Кузьмы Чорнага “Насцечка” належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце, спалучыўшы лічбу і літару (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. “Разумныя кажуць, што свет трымаецца на смелых людзях” | 1. маці Насцечкі |
| Б. “Паважае сябе толькі той, хто паважае іншых” | 2. Закрэўскі |
| В. “Я вас люблю за тое, што вы дружыце з маёй Насцечкай” | 3. Серж |
| Г. “Я думаў, што ты дадому ўцек, а ты тут быў” | 4. Мішка |

**Адказ:** А__; Б__; В__; Г__.